УДК 303.832.33

# ВЫКАРЫСТАННЕ СТУЖКІ ЧАСУ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ ДЛЯ ВІЗУАЛІЗАЦЫІ БІЯГРАФІІ ПІСЬМЕННІКАЎ

**І.В. Мармыш**
ДУА "Сярэдняя школа № 28 г. Гродна" (Рэспубліка Беларусь, 230005, г. Гродна, вул. Брыкеля, 11; e-mail: inga.sakuta@gmail.com)

Анатацыя. У дадзеным артыкуле расказваецца, як выкарыстоўваць стужку часу на ўроках беларускай літаратуры для візуалізацыі біяграфіі пісьменнікаў. Звяртаецца ўвага на электронныя стужкі часу, сэрвісы для іх стварэння.
Ключавыя словы: стужка часу, візуалізацыя.

# USE OF TIMELINE IN BELARUSIAN LITERATURE LESSONS FOR VISUALIZATION OF WRITERS 'BIOGRAPHY

**I.V. Marmysh**
SEI «Secondary school № 28 Grodno» (Belarus, Grodno, 230005, 11 Brikelya st.; e-mail: inga.sakuta@gmail.com )

Summary. This article tells how to use the timeline in Belarusian literature lessons to visualize the biography of writers. Attention is paid to electronic timeline services for their creation.
Key words: timeline, visualization.

Не толькі гісторыя як прадмет змяшчае мноства дат, храналагічных структур. Ёсць важныя даты і ў іншых навуках. Вывучэнне падзей і любых іншых элементаў у храналагічным парадку з'яўляецца праблемай для большасці студэнтаў. Стужка часу вырашае гэту праблему.

Стужка часу - гэта часавая шкала, на якой падзеі размешчаныя ў храналагічным парадку. Часцей за ўсё стужка часу ўяўляе сабой гарызантальную лінію, пазначаную гадамі (або перыядамі), якія паказваюць, што адбылося ў дадзены момант [3].

Сучасныя сэрвісы дазваляюць дадаваць у шкалу часу не толькі тэкст, але і выявы, відэа і гук. Акрамя таго, фрагмент тэксту або малюнак можа быць аформлены ў выглядзе гіперспасылкі на знешні рэсурс у інтэрнэце, у якім падзея раскрываецца больш дэталёва [1].

Так, напрыклад, на ўроках літаратуры ў выглядзе стужкі часу можна прадставіць жыццёвы і творчы шлях пісьменнікаў і паэтаў. Гэта дае ўяўленне пра эпоху, у якую працаваў пісьменнік або паэт. Стужка



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

часу выразна паказвае храналогію выхаду твораў аднаго і таго ж аўтара. Вучні могуць прасачыць перасячэнне біяграфій пісьменнікаў, асноўных падзей біяграфіі паэта ці пісьменніка, з іх суаднясеннем з ключавымі падзеямі эпохі[5].

Стужка часу — паняцце не новае. Раней яна актыўна выкарыстоўвалася ў адукацыйным працэсе, толькі малявалася на паперы.

Перавагі электронных стужак часу над папяровымі:

• шматразовае выкарыстанне — праца не губляецца ў нататніку, яе можна ўбудаваць у блог, сайт і неаднаразова спасылацца на яе;

• сацыяльнасць - работу можа праглядаць і рэдагаваць вялікая колькасць вучняў, каментаваць і ацэньваць, распаўсюджваць праз блогі, сацыяльныя сеткі;

• мультымедыйнасць - на шкале часу можна размяшчаць не толькі тэкставыя паведамленні, але і графіку і відэа;

• дызайн - праца будзе аформлена акуратна і прывабна, выканана ў адзіным стылі;

• не патрабуецца спецыяльнае праграмнае забеспячэнне - такія сэрвісы падтрымліваюцца большасцю інтэрнэт-браўзераў [4].

Калі мы першы раз даём вучням заданне стварыць стужку часу, мы павінны ім растлумачыць, што такое шкала часу і як яе правільна скласці.

Алгарытм працы па стварэнні электроннай стужкі часу:

1. Падбіраем неабходны матэрыял: у падручніку па літаратуры або ў інтэрнэце.

2. Ствараем спіс гістарычных дат з апісаннем падзей (2-3 сказы) у храналагічным парадку.

3. Да кожнай падзеі падбіраем ілюстрацыйны матэрыял. Гэта можа быць малюнак, фота, відэа, аўдыязапіс.

4. Збіраем усе матэрыялы ў асобную папку на камп’ютары.

5. Заходзім у электронны сэрвіс, каб стварыць стужку час, рэгіструемся і размяшчаем падрыхтаваны матэрыял у сэрвісе.

6. Публікуем гатовую працу ў інтэрнэце [2].

Лепш за ўсё прапанаваць выконваць такую работу ў групах, бо кожны ўдзельнік можа выбраць тую форму работы, якая яму падабаецца. Хтосьці падбярэ тэкставую інфармацыю, хтосьці фота і відэа, а хтосьці аформіць усе матэрыялы на спецыяльным сэрвісе.

Сэрвісы для стварэння часавых стужак:

TimeRime - можна дадаваць тэкст, відэа, графіку, гук (mp3) да падзей. Ёсць магчымасць працаваць разам. У бясплатнай версіі абмежаванне захоўвання створанай стужкі складае 50 МБ, колькасць



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

падзей на стужцы не больш за 100, відэа можна дадаваць толькі з YouTube.

TimeGraphics - бясплатна. На рускай і англійскай мовах. Можна дадаваць фота, відэа, Google Maps, Open Street Map да падзей. Падтрымка сумеснага рэдагавання і запаўнення. Можна ствараць прыватныя, публічныя графікі або даступныя па спасылцы. Бібліятэка падзей змяшчае 250 000 статыстычных дадзеных за 1960 год ва ўсіх краінах. Інтэграцыя з Google Anaytics, Instagram (у стадыі распрацоўкі), Facebook і многае іншае.

TimeToast - бясплатны (з абмежаваннямі) і платны доступ. Гэта сэрвіс стварэння хронікі, які мае самы просты інтэрфейс і лёгкую інтэграцыю з Facebook. Сэрвіс дазваляе ўключаць у хроніку тэкст, спасылкі і фатаграфіі. Але тут немагчыма дадаць відэа і аўдыё.

Мае вучні аддаюць перавагу апошняму сэрвісу з-за яго прастага інтэрфейсу. Калі ж патрэбна дадаць відэа ці аўдыё, карыстаюцца сэрвісам TimeRime.

ЛІТАРАТУРА

1. Баданов, А. Интерактивности: web-сервисы для образования / А. Баданов // Персональный сайт А. Баданова [Электронный ресурс]. – 2016. – Режим доступа: https://sites.google.com/site/badanovweb2/home. Дата доступа: 20.03.2022.

2. Жуковіч, М. В. Сучасныя адукацыйныя тэхналогіі на ўроках беларускай мовы і літаратуры : дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / М. В. Жуковіч. – Мінск : Аверсэв, 2015. – 252 с.

3. Кашлеў, С.С. Тэхналогія інтэрактыўнага навучання / С. С. Кашлеў. – Мінск, 2005 - 196с.

4. От приёмов педагогической техники к приёмам мультимедийной дидактики. Режим доступа: http://surl.li/bpntj. Дата доступа: 20.03.2022

5. Рощина, И.В. Средства визуализации современного урока языка и литературы // ГУО "Минский областной ИРО" [Электронны рэсурс]. – Режим доступа: http://surl.li/axeez. – Дата доступа: 20.03.2022.

УДК 378.14

## ПОВЫШЕНИЕ ПОЗНАВАТЕЛЬНОГО ИНТЕРЕСА СТУДЕНТОВ ЭКОНОМИЧЕСКИХ СПЕЦИАЛЬНОСТЕЙ К УЧЕБНОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ

**М.В. Молохович**
Белорусский государственный университет
(Республика Беларусь, 220030, г. Минск, пр-т Независимости, 4;
e-mail: malakhovich_m@mail.ru)

Аннотация. Статья посвящена решению проблем повышения познавательного интереса студентов экономических специальностей к



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ